**Беларускае аб'яднанне ў Швейцарыі**
**Belarussische Vereinigung in der Schweiz**
**Belarusian Association in Switzerland**

Huebwiesenstr. 31 | CH-8954 Geroldswil | Schweiz
www.**belswiss**.org | facebook.com/**belswiss**
info@belswiss.org | +41 79 938 82 15
IBAN: **CH10 0900 0000 6055 0578 2**



Шаноўныя сябры! **Шчыра запрашаем** вас на

# КУПАЛЛЕ

Мы прапануем вам забыцца на жыццёвыя праблемы і аднастайную штодзённасць, апынуцца ў месцы, дзе вас чакае таямнічае і чарадзейнае Купалле. Разам з Купалай і Купалкай мы пройдзем па сцяжынках векавой гісторыі, навучымся танчыць старадаўнія танцы і вадзіць карагоды, спяваць купальскія песні і плесці вянкі, пагуляем у гульні і пакаштуем беларускіх прысмакаў.

Вас чакае ўтульная **атмасфера**, смачная **ежа**, насычаная **праграма** для дарослых і дзяцей і шмат **уражанняў**! І — хто ведае? — магчыма, менавіта гэтым вечарам мы знойдзем сапраўдную папараць-кветку…

Адмыслова на гэтае свята мы чакаем **спецыяльных гасцей з Беларусі**:

арт-групу **«ДЗІВАСІЛ»** з праграмай **«КУПАЛЬСКІ АГОНЬ»**
(з жывым гукам і элементамі фаер-шоў)

**Прыходзьце самі і запрашайце сваіх сяброў і знаёмых!**
Будзе весела, цікава, шматнацыянальна і смачна!

## Дата і час

Субота, **24 чэрвеня** 2017
Пачатак а **16:00**, канец «афіцыйнай» часткі а **20:00**
(Не спазняйцеся, інакш прапусціце ўсё самае цікавае!)

## Месца правядзення

Бераг возера **Грайфэнзее** (*Greifensee*), каля вёсцы **Устэр** (*Uster*), кантон Цюрых.
3D-выгляд буйным планам на Google Maps: http://bit.ly/2rxXQNs
Мапа мясцовасці з умоўнымі адзнакамі: https://map.search.ch/d/dlkmtc3mg

Дабрацца магчыма (гл. таксама мапу):

- на грамадскім транспарце: **аўтобус № 817** да *Uster, See*, потым 10 хвілін пешкі па *Uferweg*; альбо **аўтобус № 816** да *Uster, Post Niederuster*, потым 20 хвілін пешкі па *Seestrasse — Alte Riedikerstrasse — Harnischbaum-Weg*.
- аўтамабілем: **аўтабан A1/A4**, з'езд 66 *Brüttisellen-Kreuz*, накірунак *Uster*; па навігатары — на *Seefeldstrasse 50* (платная **паркоўка** знаходзіцца побач, на *Alte Riedikerstrasse*, 10 хвілін пешкі да месца правядзення мерапрыемства).

Па жаданню можа быць арганізаваны **падвоз у межах Устэра** і бліжэйшага наваколля. Таксама дапаможам з каардынацыяй **сумесных аўтамабільных паездак** з іншых рэгіёнаў.

## Фармат мерапрыемства

Свята Івана Купалы пройдзе на беразе возера Грайфэнзее ў нефармальнай абстаноўцы: народныя і сярэднявечныя танцы, карагоды ля і скокі праз вогнішча, майстар-клас па пляценні вянкоў, гульні і забаўлянкі для дзяцей і дарослых, вольныя камунікацыі, новыя знаёмствы, жывая музыка і аўтэнтычныя спевы.

Будзе арганізаваны агульны стол з алкагольнымі і безалкагольнымі напоямі, беларускімі нацыянальнымі закускамі, аднаразовым посудам і неабходнымі паходна-кухоннымі прыладамі. На працягу вечара будзе магчымасць набыць загадзя заказаны шашлык.

Працоўная мова — беларуская (з паслядоўным перакладам на рускую, нямецкую, ангельскую, імправізацыйна-пальцавую і, па жаданні, на іншыя).

## Фінансы

Унёсак удзельніка — **35** шв. франкаў. Для зарэгістраваных сябраў Аб'яднання — **20** шв. фр. Дзеці/падлеткі да 16 гадоў, а таксама ганаровыя госці — **бясплатна**.

Порцыя шашлыку (250 г) — **10** шв. франкаў. (Калі ласка, **замаўляйце загадзя!**)

У кошт унёску уваходзіць амаль што усё **(!)** — інфраструктура, праграма, ежа*, напоі!
(* Шашлык аплачваецца асобна.)

Аплаціць унёсак можна наяўнымі на месце альбо папярэднім пераводам на наш банкаўскі рахунак:
*Assoziation der WeissrussInnen in der Schweiz*, **CH10 0900 0000 6055 0578 2** (PostFinance).

## Рэгістрацыя

Калі ласка, **абавязкова паведаміце нам** (гл. раздзел «Кантакты» ніжэй) аб сваім жаданні прыняць удзел у мерапрыемстве, вызначце колькасць і катэгорыю ўдзельнікаў (гл. вышэй) і, калі трэба, колькасць порцый шашлыку. **Дзякуй загадзя!**

## Дадатковая інфармацыя

Пры сабе пажадана мець:

- нацыянальныя строі сваёй краіны альбо вопратку, якая іх імітуе;
- купальныя прыналежнасці (плавальны касцюм, ручнік);
- купальскі вянок (яго можна таксама сплесці адразу на свяце);
- добры настрой.

## Кантакты


| | |
|---|---|
| Беларускае аб'яднанне ў Швейцарыі | **info@belswiss.org**<br>facebook.com/**belswiss** |
| Сяргей Сіроткін | **+41 79 582 25 81** |
| Алесь Сапега | +41 78 666 70 90 |


**Будзем радыя сустрэчы з вамі!**